ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА. БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (1021). ● ЧАЦВЕР, 13 верасня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## НАВІНЫ

На пасяджэнні партыйнага камітэта абмеркаван ход падрыхтоўкі да новага навучальнага года ў сетцы партыйнай асветы.

●

Савет БДУ разгледзеў вынікі 1972—1973 навучальнага года і абмеркаваў задачы па далейшаму ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчай работы. З дакладам выступіў прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар С. А. Умрэйка.

●

Чатыры групы замежных студэнтаў праходзяць вераснёўскую практыку ў нашым універсітэце. З польскіх гарадоў Кракава і Катовіц прыехалі філолагі, з ГДР—хімікі і матэматыкі. Пасля заканчэння практыкі юнакі і дзяўчаты наведаюць сталіцу нашай Радзімы—Маскву.

●

Першы ў гэтым навучальным годзе традыцыйны выезд на прамысловыя прадпрыемствы зрабілі лектары БДУ — члены таварыства «Веды».

*КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ*

## НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ

У камітэтах камсамола факультэтаў прыбавілася клопату. Прыйшло новае папаўненне. Амаль дзве тысячы чалавек патрэбна паставіць на ўлік у самыя сціслыя тэрміны. Многія факультэты — журфак, матфак — справіліся з гэтым амаль за два дні перад выездам на сельскагаспадарчую працу. Але ж не на ўсіх факультэтах рабоце па пастаноўцы на ўлік аддаюць аднолькавую ўвагу. Толькі таму, напрыклад, на геафаку, фізфаку, філфаку доўгі час па розных прычынах камсамольцы не стаяць на ўліку. Гэта, зразумела, наносіць шкоду дысцыпліне, цягне за сабой запазычанасць ва ўплаце членскіх узносаў, а потым вядзе да вялікай блытаніны ў агульным уліку камсамольцаў у нашым універсітэце. Таму патрэбна тэрмінова паслаць запыты аб уліковых картках, разабрацца з персанальнымі справамі, якія непазбежна ўзнікнуць. Гэта патрэбна зрабіць да выбараў на першым курсе, якія адбудуцца ў другой палове верасня.

На старэйшых курсах, патоках і ў групах выбары ўжо прайшлі. Цяпер, да 15 кастрычніка, мы павінны правесці справаздачныя сходы на факультэтах, а 25 кастрычніка адбудзецца агульнауніверсітэцкая справаздачна-выбарная канферэнцыя.

Гэтым падзеям павінна папярэднічаць вялікая праца. Па-першае, патрэбна правесці зверку членаў нашай арганізацыі па групах, курсах, факультэтах. Наколькі сур'ёзная гэта справа, можна меркаваць па такіх фактах: у мінулым годзе пры зверцы выявілася, што амаль 200 чалавек з 1968 года не сталі на ўліку, а 300 выбылі з універсітэта ў невядомым кірунку і не зняліся з уліку.

Ужо цяпер неабходна вызначыць людзей, якія будуць займацца зверкай, і дасканала вывучыць тэхніку гэтай працы. Час не церпіць — зверку патрэбна зрабіць да справаздачных сходаў. Зараз, напрыклад, можна і неабходна правесці зверку пятых курсаў усіх факультэтаў. Многія з пяцікурснікаў на вытворчай практыцы, але ў многіх бываюць і заняткі ва універсітэце.

На справаздачных сходах факультэтаў неабходна вылучыць дэлегатаў на агульнауніверсітэцкую канферэнцыю. Ад 60 чалавек на канферэнцыю пасылаецца адзін дэлегат.

Не менш адказная і складаная праца — вылучэнне актыву ў новы састаў камітэта камсамола. Мы вельмі слаба абапіраліся на дапамогу партыйных бюро; амаль не даручалі камсамольскую работу маладым выкладчыкам, аспірантам. Патрэбна выкарыстоўваць вопыт вну Масквы, Ленінграда, дзе лозунг «Кожны малады камуніст абавязан працаваць у камсамоле» абавязкова ажыццяўляецца.

Патрэбна звярнуць пільную ўвагу на структуру кіруючых органаў у нашай камсамольскай арганізацыі. На многіх факультэтах яна няправільная — працуюць так, як пяць і больш год назад. Бывае часта так: на камітэце камсамола, напрыклад, абмяркоўваюць работу ваенна-патрыятычнага сектара. Пытаемся, а чаму адсутнічаюць члены гэтага сектара? Высвятляецца, што сам загадчык выконвае абавязкі ўсяго сектара. А ў ім жа павінна быць не менш пяці чалавек. Факультэцкія арганізацыі ў нас вельмі вялікія, і, вядома, адзін чалавек фізічна не можа справіцца з абавязкамі ўсяго сектара.

Неабходна таксама вызначыць выдатнікаў вучобы, камсамольцаў, якія служылі ў Савецкай Арміі і маюць вопыт камсамольскай работы, правесці з імі гутаркі ў партыйных бюро і камітэтах камсамола, каб ведаць, наколькі яны кампетэнтныя ў пытаннях камсамольскай работы.

Да справаздачна-выбарных сходаў кожнаму сектару патрэбна падрыхтаваць кароткую справаздачу, абмеркаваўшы яе на сваім пасяджэнні. Справаздачны даклад павінен адлюстраваць усе бакі камсамольскай працы. У ім неабходна прааналізаваць канкрэтныя факты, зрабіць вывады. Асабліва пільна трэба вывучыць недахопы, якія мелі месца ў рабоце пярвічных арганізацый, бюро груп, асобных камсамольцаў. Камітэтам камсамола патрэбна крытычна разгледзець недастатковую работу вучэбных, культмасавых, спартыўных сектараў, а таксама тых камсамольцаў, якія адказваюць за працу ў інтэрнатах.

Выбары ў нашай камсамольскай арганізацыі павінны прайсці на высокім ідэйна-палітычным узроўні, спрыяць далейшым поспехам у вучобе і выхаванні студэнтаў.

**А. СЛУКА,**
**сакратар камітэта камсамола БДУ.**

## ІНСТЫТУТ ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Згодна з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» пры БДУ створан інстытут павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук вышэйшых навучальных устаноў.

Па накіраваннях Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у Мінск прыехалі выкладчыкі філасофіі, гісторыі КПСС і палітэканоміі з Прыбалтыкі, Казахстана, закаўказскіх рэспублік. Разам з беларускімі калегамі яны на працягу пяці месяцаў будуць павышаць свой ідэйна-тэарэтычны і навукова-метадычны ўзровень, выступаць з навуковымі дакладамі.

У вучэбных планах прадугледжаны выступленні слухачоў з лекцыямі на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах рэспублікі, педагагічная практыка на кафедрах грамадскіх навук мінскіх вну, навуковая распрацоўка методык выкладання грамадскіх навук.

— У арганізацыі работы інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук у нас ужо ёсць некаторы вопыт, — сказаў карэспандэнту БЕЛТА дырэктар інстытута кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. Д. Малочка. — На пяць гадоў раней пры універсітэце быў створан факультэт павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін тэхнікумаў. Факультэт садзейнічае ўдасканаленню педагагічнага майстэрства вялікага атрада работнікаў сярэдніх навучальных устаноў Беларусі, Прыбалтыкі і Малдавіі. Вопыт работы іншых інстытутаў краіны і факультэта мы выкарыставалі пры стварэнні новага інстытута. Тут будуць працаваць акадэмік Акадэміі навук БССР Н. К. Буслаў, члены-карэспандэнты АН БССР прафесары І. М. Ігнаценка, У. М. Сікорскі, В. І. Сцяпанаў і іншыя вядучыя грамадазнаўцы рэспублікі, а таксама вядомыя вучоныя Масквы, Ленінграда, Кіева.

4 верасня, у першы дзень заняткаў, з дакладам «Задачы кафедраў грамадскіх навук у святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС і пастановы ЦК КПСС «Аб мерах па далейшаму ўдасканаленню вышэйшай адукацыі ў краіне» выступіў начальнік аддзела выкладання грамадскіх навук Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР прафесар А. П. Шаптулін.

Перад слухачамі выступілі сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў. На адкрыцці інстытута прысутнічаў загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч.

**(БЕЛТА).**

*ПАЧАТАК БІЯГРАФІІ*

## ПАСВЯЧЭННЕ Ў СТУДЭНТЫ





**Актавая зала запоўнена ўсхваляванымі хлопцамі і дзяўчатамі. Многія прыйшлі сюды яшчэ з татамі і мамамі. Гэта ж так незвычайна: яны — першакурснікі — будучыя фізікі, паўнапраўныя ўдзельнікі гэтага сходу.**

**З цёплым словам да новага папаўнення звяртаецца дэкан факультэта Іван Паўлавіч Зяцькоў. Дзве тысячы студэнтаў дзённага аддзялення прыйдуць у гэтым годзе ў аўдыторыі, на кафедры і ў лабараторыі факультэта, каб атрымаць адну з 11 спецыяльнасцей. Галоўная задача, якая стаіць зараз перад імі,—навучыцца пераадольваць цяжкасці і жыць самастойна. Фізіка чакае смелых і захопленых людзей!**

**Наказ першакурснікам даюць загадчык кафедры агульнай матэматыкі і матэматычнай фізікі Ю. С. Багданаў, загадчык кафедры фізікі паўправаднікоў В. Д. Ткачоў, студэнт V курса А. Маёнаў і іншыя.**

**Пётр Жых — студэнт II курса. Яшчэ жывуць у яго памяці абітурыенцкія хваляванні, радасць ад усведамлення таго, што ты студэнт. Таму вельмі непасрэдна і шчыра гучаць яго прывітанне і заклік брацца за справу з першага дня.**

**Гавораць, што паўнапраўным студэнтам можна лічыць сябе толькі тады, калі атрымаеш заліковую кніжку і студэнцкі білет. У гэтым сэнсе пашчасціла Васілю Агееву і Людзе Барташэвіч. Ім першым студэнцкія атрыбуты уручыў намеснік дэкана А. А. Чупрыгін.**

**НАШ КАР.**

## РЭКАМЕНДАВАНЫ Ў АСПІРАНТУРУ

МІНУЎ «гарачы» жнівень. Аднак уступныя экзамены не скончыліся. Цяпер перад прадстаўнічымі камісіямі дактароў і кандыдатаў навук трымаюць экзамен людзі, якія жадаюць прысвяціць сябе навуковай дзейнасці.

Загадчык аддзела аспірантуры Э. В. Драб расказвае:

— Аспірантура БДУ з'яўляецца асноўнай формай падрыхтоўкі навуковых і навукова-даследчых кадраў як для нашага універсітэта, так і для іншых вну і арганізацый. У гэтым годзе на дзённае і завочнае аддзяленні аспірантуры будзе залічана 150 чалавек. Нягледзячы на тое, што план прыёму ў параўнанні з 1970 годам павялічыўся ў 1,5 раза, конкурс таксама ўзрос. Вялікая колькасць заяў падана на спецыяльнасці гісторыя КПСС, тэорыя навуковага камунізму, палітэканомія, геаметрыя і тапалогія, дыферэнцыяльныя і інтэгральныя ўраўненні і матэматычная кібернетыка і іншыя.

Цяпер набор ідзе па 65 спецыяльнасцях. Упершыню ў гэтым годзе пачынаецца падрыхтоўка аспірантаў па новай ва універсітэце спецыялізацыі — тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка. У падрыхтоўцы кадраў гэтага профілю акажуць дапамогу вучоныя Маскоўскага універсітэта.

Састаў паступаючых самы разнастайны. Больш паловы прэтэндэнтаў здалі поўнасцю або часткова экзамены кандыдацкага мінімуму, маюць апублікаваныя работы, выступалі з дакладамі на навуковых канферэнцыях. Гэта Ф. С. Піліпавец, В. І. Ігнаценка, Г. М. Барздоў, В. З. Протчанка.

Выпускнікі гэтага года Руслан Наумовіч, Таццяна Калюжная, Уладзімір Хоміч, якія з адзнакай закончылі універсітэт, пачыналі свой шлях да аспірантуры ў студэнцкіх навуковых гуртках.

22 чалавекі з вну і арганізацый Беларусі накіраваны ў мэтавую аспірантуру.

Экзамены яшчэ не закончаны. Пажадаем жа паступаючым выдатных адзнак.

**В. БЯЛЯЎСКАЯ.**

# ПАЧАТАК БІЯГРАФІІ

**Першы студэнцкі год — новая старонка біяграфіі ў тых юнакоў і дзяўчат, што пераступілі парог БДУ. Сярод іх — школьнікі і былыя настаўнікі, слесары, кранаўшчыцы, машыністкі і трактарысты, воіны Савецкай Арміі, людзі самых разнастайных прафесій. Адны прыйшлі да студэнцтва праз гады працоўнага выпрабавання на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах. Іншыя матэнакіравана папаўнялі запас ведаў па выбранай спецыяльнасці ў школах юных фізікаў, хімікаў, матэматыкаў, біёлагаў. Амаль на кожным факультэце вялікі атрад медалістаў і выдатнікаў. Найбольшы, мабыць, на ФПМ — больш як 100 чалавек. Вельмі многія маюць пахвальныя граматы за поспехі ў вывучэнні розных школьных дысцыплін. Гэтыя штрыхі біяграфіі сённяшніх першакурснікаў даюць падставы меркаваць, што ва універсітэт прыйшло моцнае папаўненне і можна чакаць ад яго выдатных поспехаў ва ўсіх галінах студэнцкага жыцця.**

## СЛОВА МАЕ ПЕРШАКУРСНІК

У ГЭТЫЯ першыя вераснёўскія дні ў камітэце камсамола шматлюдна, як ніколі. Доўгі ланцуг юнакоў і дзяўчат цягнецца да столікаў з шыльдачкамі: «Пастаноўка на ўлік студэнтаў I курса». Да некаторых з іх і звярнуўся наш карэспандэнт з просьбай расказаць пра сябе, пра першыя ўражанні ад сустрэчы з універсітэтам.

**Аляксандр Дубавец, юрыдычны факультэт:**

— Скончыў у гэтым годзе школу № 19 г. Мінска. На юрыдычны прыйшоў таму, што факультэт дае трывалыя і шырокія веды. Сваіх аднакурснікаў усіх разам упершыню ўбачыў на сходзе 1 верасня. Яны мне спадабаліся.

**Вольга Казінец, філалагічны факультэт:**

— Яшчэ ў пятым класе ў сачыненні «Мая мара» я напісала, што хачу быць літаратарам. Скончыла сваю Пяскоўскую СШ Бярозаўскага раёна і падала заяву ў Брэсцкі педагагічны. Але мне не пашанцавала. Потым працавала два гады ў вясковай школе. Калі ўпершыню прыйшла ва універсітэт ужо студэнткай, адчула бязмежную радасць і шчасце. І жаданне вучыцца стала яшчэ большым.

**Ніна Мітрафанава, геаграфічны факультэт:**

— Нарадзілася і вырасла я ў Крыме. Там жа скончыла педвучылішча, тры гады працавала. Хацелася вучыцца далей. З вашым горадам мяне звязала выпадковасць: неяк праездам трапіла я ў Мінск, паблукала па яго вуліцах і парках — і палюбіла назаўсёды.

Саша Кабашнікаў і Саша Жураўскі — даўнія сябры. Колькі памятаюць сябе, жывуць у адным двары. Больш рухавы і жывы Саша Жураўскі добра дапаўняе спакойнага і разважнага Сашу Кабашнікава. І нават тое, што вучыліся ў розных школах, не перашкаджае іх дружбе. І ў БДУ прыйшлі разам, праўда, на розныя факультэты.

**Саша Кабашнікаў, біялагічны факультэт:**

— Рашэнне стаць біёлагам — не выпадковае. Некалькі год займаўся ў школе юнага біёлага пры Акадэміі навук БССР. На занятках у гэтай школе мы не толькі прайшлі ўвесь асноўны курс, але і пазналі многа такога, што стаіць па-за школьнай праграмай. Цяпер я ўжо нават выбраў кафедру, на якой бы хацеў працаваць, — заалогіі пазваночных.

**Саша Жураўскі, філалагічны факультэт:**

— На філфак мяне прывялі не толькі любоў да літаратуры, а і гарачае жаданне даказаць, што філалогія — занятак не толькі для дзяўчат.

Розныя людзі прыйшлі сёння ў камітэт камсамола. Адны некалькі год працавалі, другія — толькі што пакінулі школьную парту. А ў вну іх прывяло адзінае жаданне — вучыцца.

## З ДРУГОЙ СПРОБЫ

З МІШАМ я пазнаёміўся ў прыёмнай камісіі, калі ён здаваў дакументы для паступлення на факультэт журналістыкі. «Настойлівы хлопец, — сказалі мне. — Другі раз паступае».

Разгаварыліся. Міхаіл жыве ў Вілейскім раёне. Да шостага класа жыў і вучыўся ў Казахстане, а заканчваў сярэднюю школу ўжо ў Беларусі. Пасля заканчэння школы зноў сеў за кнігі — рашыў паступаць ва універсітэт.

І вось ён у Мінску. Зноў кнігі, перажыванні, бяссонныя ночы. Але дзесьці, відаць, хлопец не дапрацаваў, а можа і хваляванне было вельмі вялікім — атрымаў па сачыненню тройку. Да апошняга моманту спадзяваўся, што раптам павязе. Некалькі разоў перачытаў кожны радок спісаў «шчаслівчыкаў». Яго прозвішча там не было.

...Нялёгка было вяртацца дадому. Першыя дні хадзіў сам не свой. Цяжка было ўсведамляць, што вінават у сваёй няўдачы сам...

Хутка ў газеце «Шлях перамогі» ўсё часцей сталі з'яўляцца заметкі за подпісам Міхаіла Жураўовіча. Гэта былі толькі першыя нясмелыя крокі. Падганяла прыкрасць, што яму не хапіла ведаў пры паступленні ва універсітэт, і ён пачаў займацца на завочных падрыхтоўчых курсах. Цяжка было, бо працаваў на будаўніцтве дарог. Але Міхаіл ганарыцца, што будаваў дарогі, такія неабходныя ўсім людзям. А потым на мэблевай фабрыцы Міхаіл набыў вопыт столяра-зборшчыка.

...Я ўспомніў, як ахарактарызавалі М. Жураўовіча ў прыёмнай камісіі, і задаў, мабыць, не вельмі тактоўнае пытанне: «Як думаеш, у гэтым годзе станеш студэнтам?» Субяседнік, як мне здалося, крыху разгубіўся. Я зразумеў свой промах: які абітурыент не спадзяецца стаць студэнтам! Але Міша хутка справіўся з хваляваннем і адказаў: «Але, стану, павінен стаць, таму што многа займаўся».

І вось наступіў доўгачаканы дзень, калі з радасцю і трывогай абітурыенты паведамляюць адзін аднаму: «Спісы вывесілі!» У загадзе стаяла і прозвішча Міхаіла Жураўовіча. Рубеж узят з другой спробы.

Хочацца павіншаваць усіх шчаслівых першакурснікаў з паступленнем ва універсітэт і пажадаць ім студэнцкага ні пуху, ні пер'я!

**А. БЕЗБАРОДЫ.**

## «ДУШЫ ЦУДОЎНЫЯ ПАРЫВЫ»

Атмасфера ў пакоі прыкметна змянілася, як толькі ён пераступіў парог. І я стаў сведкай і амаль удзельнікам спрэчкі аб Канце і канціянстве, аб класіках літаратуры, аб Энштэйне. Хлопец мне спадабаўся, і захацелася пазнаёміцца бліжэй.

**— Адрэкамендуйцеся, калі ласка, нашым чытачам.**

— Андрэй Яхнавец, студэнт першага курса фізічнага факультэта.

**— Уступныя экзамены ззаду. Якія ўражанні ад іх засталіся ў вас?**

— Я зразумеў, што мне пашчасціла на 80 працэнтаў.

— Але ж аднаго шчасця мала, — гэта ўмяшаўся ў нашу гутарку сусед па пакоі.

— Можа быць, гэта было не толькі шанцаванне. Цэлы ж год займаўся.

**Чаму вы выбралі фізіку і як адносіцеся да «лірыкаў»?**

— Для пачатку лягчэй адказаць на другую частку пытання. Без «лірыкаў» было б сумна. Цяпер чаму выбраў фізіку. Яшчэ ў дзяцінстве я многа чытаў фантастыкі, якая скрозь пранізана фантастычнай фізікай.

Спадабалася фізіка за яе неабмежаваныя магчымасці. І яшчэ, фізіка значна матэрыяльней і сучасней, чым, скажам, матэматыка.

**— Хто такі абітурыент, вам вядома. А якім, па вашаму ўяўленню, павінен быць студэнт?**

— Як гаварыў адзін мой сябар, студэнт павінен «грызці і грызці граніт навукі». Хаця загадзя вядома, што да канца яго ніколі «не дагрызеш». А «грызці навуку» дапамагае заўсёды добры настрой і пастаяннае пачуццё гумару.

**— Вашы планы на пяць студэнцкіх год?**

— Баюся быць нясціплым, таму адкажу коратка: мару закончыць універсітэт і стаць вучоным.

**Наш кар.**

## УДАРНЫЯ КАМСАМОЛЬСКІЯ

**«Залічыць студэнтамі першага курса...» Колькі радасці прыносяць гэтыя словы, калі пад імі чытаеш сваё прозвішча. А тым, хто не трапіў у заветны спіс, да слёз крыўдна. У адных апускаюцца рукі, іншыя рашуча заяўляюць, што на наступны год яны абавязкова стануць студэнтамі.**

**Але як пражыць гэты год? У няўдачніка з'яўляецца маса праблем: куды ўладкавацца на работу, як нагнаць упушчанае ў вучобе? Камітэты камсамола вну шукаюць розныя формы дапамогі абітурыентам. І ў нашым універсітэце ў гэтым годзе камплектуюцца будаўнічыя атрады з абітурыентаў. Яны будуць працаваць у Мінску, Магілёве, Лідзе, Гродна, Смаргоні.**

**Вельмі цікавы вопыт работы з тымі, хто не прайшоў па конкурсу, ёсць у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Тут вось ужо чатыры гады існуюць камсамольскія ўдарныя атрады з абітурыентаў.**

**Фарміраванне атрадаў пачынаецца на субяседаванні з тымі, хто не прайшоў па конкурсу. Тым, хто хоча «паспрабаваць шчасце» яшчэ раз, прапануюць уступіць у камсамольскія ўдарныя атрады.**

**«Ударнікі» працуюць у вучэбна-доследнай гаспадарцы акадэміі: будучыя заатэхнікі — на вопытнай станцыі племянной жывёлагадоўлі, а астатнія — на вопытных палях. Больш складана з будучымі эканамістамі і бухгалтарамі, але і ім мы спрабуем знайсці работу па профілю спецыяльнасці. Напрыклад, многія з іх працуюць учотчыкамі. Патрэбна агаварыцца, што заработкі ў рабят невялікія, але ніхто на гэта не наракае. Члены атрадаў жывуць ці ў студэнцкіх інтэрнатах, ці ў спецыяльна пабудаваных доміках. На працягу двух год выкладчыкі акадэміі вечарамі праводзяць з імі заняткі.**

**Асноўная маса членаў камсамольскіх ударных атрадаў праз два гады паступае ў акадэмію на дзённую або завочную форму навучання. Завочнікі, як правіла, і працаваць застаюцца ў вопытнай гаспадарцы. За чатыры гады было ўсяго некалькі выпадкаў, калі рабяты расчароўваліся ў сваёй будучай прафесіі і паступалі ў другія інстытуты. «Выпрабаванне на вернасць» сваёй спецыяльнасці яны не вытрымалі, таму што памыліліся ў выбары.**

## НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ...

Трынаццаты раз падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян прымае на вучобу юнакоў і дзяўчат з розных краін свету. Многія выхаванцы факультэта, атрымаўшы вышэйшую адукацыю ў розных гарадах нашай краіны, паехалі да сябе на радзіму з дыпломамі ўрачоў, педагогаў, інжынераў. Сотні выпускнікоў працягваюць зараз вучобу ў вну Масквы, Ленінграда, Мінска, Кіева, Харкава і іншых гарадоў.

З кожным годам колькасць краін, якія пасылаюць моладзь на падрыхтоўчы факультэт універсітэта, павялічваецца. Так, калі першы прыём на факультэт у 1961—1962 навучальным годзе быў выключна з моладзі Рэспублікі Куба, то ў апошнія гады на факультэце праходзілі падрыхтоўку студэнты з краін Афрыкі: Кеніі, Гвінеі, Малі, Самалі, Сьера-Леоне і іншых краін.

З 1966 года і штогод на факультэце займаюцца юнакі і дзяўчаты з В'етнама. З 1972 года на вучобу прыязджаюць студэнты Афганістана, Рэспублікі Бангладэш. У гэтым навучальным годзе на факультэце будуць займацца каля 180 пасланцоў з многіх краін. Ужо ў першай палове верасня на факультэт прыбыла моладзь з 13 краін Азіі і Афрыкі.

У інтэрнацыянальную студэнцкую сям'ю факультэта ўпершыню ўвайшла моладзь з Лаоса, Лівана, Марока, Федэратыўнай Рэспублікі Нігерыі, Іярданіі і іншых краін.

**М. НЕЧЫПАРЭНКА,**
**старшы інспектар**
**падрыхтоўчага факультэта.**







*НА ЗДЫМКАХ:*

*1. У фанетычным кабінеце студэнты адпрацоўваюць вымаўленне рускіх слоў.*

*На пярэднім плане (злева направа): студэнт з Лівана Хайдэмус Самі і студэнт з Бангладэш Хасейн Тофазал.*

*2. Першы ўрок з групай в'етнамскіх студэнтаў вядзе ст. выкладчык Т. І. Анісімава.*

*3. Перапынак таксама выкарыстоўваецца для вывучэння рускай мовы: узбагачаецца моўная лексіка.*

Фота аўтара.



Ва універсітэцкім скверы.

# І. М. ЛУШЧЫЦКІ

Беларуская савецкая навука і культура панеслі цяжкую страту—памёр Іван Мікалаевіч Лушчыцкі, заслужаны дзеяч навукі БССР, член-карэспандэнт АН БССР, доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі, член Камуністычнай партыі Савецкага Саюза з 1926 года.

Іван Мікалаевіч Лушчыцкі нарадзіўся ў 1907 годзе ў вёсцы Агароднікі Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў беднай сялянскай сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў пастухом па найму.

У семнаццаць гадоў І. М. Лушчыцкі выбіраецца сакратаром, а затым—старшынёй Цімкавіцкага сельсавета Капыльскага раёна. У 1930 годзе скончыў БДУ, а ў 1933—аспірантуру АН БССР. З 1934 года—сакратар парткома АН БССР, вучоны сакратар і старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і права акадэміі. У чэрвені 1941 года І. М. Лушчыцкі добраахвотнікам пайшоў на фронт. У радах дзеючай арміі прайшоў ад Масквы да Кенігсберга, удзельнічаў у Сталінградскай бітве і вызваленні Беларусі. За баявыя заслугі ўзнагароджан трыма ордэнамі і многімі медалямі.

З 1946 года пасля дэмабілізацыі з радоў Савецкай Арміі І. М. Лушчыцкі працуе вучоным сакратаром прэзідыума АН БССР, намеснікам дырэктара Інстытута філасофіі і права. Доктар філасофскіх навук з 1952 года. Апошнія 20 гадоў прафесар І. М. Лушчыцкі бязменна ўзначальваў кафедру гісторыі філасофіі і логікі. Ён унёс вялікі ўклад у развіццё навукі і падрыхтоўку кадраў для народнай гаспадаркі рэспублікі. Ім апублікавана звыш 90 навуковых работ і падрыхтаваны 43 доктары і кандыдаты навук.

Побач з навуковай і вучэбна-педагагічнай, І. М. Лушчыцкі вёў велізарную грамадскую работу, неаднаразова выбіраўся членам раённага і гарадскога камітэтаў КП Беларусі, дэпутатам Мінскага гарсавета, шмат гадоў узначальваў гарадское таварыства «Веды», нястомна прапагандаваў ідэі марксізму-ленінізму ў масах. Партыя і ўрад высока ацанілі яго навуковую і грамадскую дзейнасць, удастоіўшы ордэнаў Леніна, «Знак Пашаны» і іншых высокіх узнагарод. У 1971 годзе яму прысвоена ганаровае званне заслужанага дзеяча навукі БССР.

І. М. Лушчыцкаму былі ўласцівы партыйная прынцыповасць, душэўная цеплыня і чуласць. Ён шмат сіл і энергіі аддаў выхаванню моладзі ў духу ленінскіх запаветаў. Ва ўсіх, хто ведаў Івана Мікалаевіча, ён заваяваў павагу і любоў сваёй глыбокай навуковай эрудыцыяй, прастатой і сціпласцю, чуласцю і таварыскімі адносінамі да людзей.

Светлая памяць пра Івана Мікалаевіча Лушчыцкага, выдатнага вучонага і педагога, грамадскага дзеяча, палымянага камуніста і патрыёта назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Рэктарат, партком, мясцком.

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

# ТАВАРЫШ ВЕРА

У першыя месяцы 1924 года ў ячэйках Камуністычнага Саюза Моладзі Заходняй Беларусі пачала з'яўляцца незнаёмая дзяўчына — прадстаўнік Цэнтра. Невысокая, зусім звычайная з выгляду. Хіба толькі вочы — глыбокія, быццам беларускія азёры. Вясёлая, энергічная, яна валодала дарам хутка асвойвацца ў новых для яе абставінах, з усімі адразу ж знаходзіла агульную мову. Яна была агітатарам па прызванню.

Калі на пасяджэннях камсамольскіх ячэек, на масоўках у вёсцы аб'яўлялі, што з дакладам выступіць таварыш Вера, яна прасіла:

— Завіце мяне, калі ласка, проста Вера...

І ўсе адчувалі: гэта не ад імкнення да лёгкай папулярнасці, гэта — ад сапраўднай сціпласці. Імення такой заставалася ўсё сваё жыццё сакратар ЦК ЛКСМ Заходняй Беларусі, славутая дачка беларускага народа Вера Харужая.

***

Харужая Вера Захараўна нарадзілася ў 1903 годзе ў Бабруйску. Была сельскай настаўніцай. Удзельнічала ў барацьбе з ворагамі маладой Савецкай улады. Працавала ў Мазырскім, Бабруйскім укомах камсамола. Член Камуністычнай партыі з 1921 года.

В. З. Харужая закончыла цэнтральную саўпартшколу ў Мінску. Працавала ў апараце ЦК камсамола Беларусі; рэдагавала газету «Малады араты»; з 1924 года В. З. Харужая — на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. Сем год правяла яна ў турэмных засценках белапанскай Польшчы. У 1930 годзе за заслугі ў рэвалюцыйным руху Заходняй Беларусі ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

З 1932 г. В. Харужая зноў на свабоднай савецкай зямлі.

У першыя дні вайны з фашыстамі Вера Захараўна пайшла ў партызанскі атрад. Пасля кароткага перапынку яна ў віцебскім падполлі.

Закатавана ворагамі ў канцы 1942 года.

Званне Героя Савецкага Саюза В. З. Харужай прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 17 мая 1960 года.

***

Восенню 1941 года Вера Харужая перайшла цераз лінію фронту.

— Мяне прыслаў камандзір атрада Васіль Корж, — далажыла сакратару ЦК КПБ П. З. Калініну. — Нам патрэбна пастаянная сувязь з ЦК... Нам патрэбны зброя, боепрыпасы, медыкаменты...

Вярнуцца ў той час назад, у партызанскі атрад, Вера Захараўна не змагла, бо чакала дзіцяці. Яе эвакуіравалі ў тыл краіны. Працуючы калгасным рахункаводам, яна не пераставала думаць аб вяртанні ў партызанскі атрад. З гэтымі думкамі ў сакавіку 1942 года і паехала ў Маскву.

— Пашліце мяне ў варожы тыл, — настойвала ў штабе партызанскага руху.

— А як жа дзеці? Сынок зусім маленькі. За дачкой таксама патрэбен догляд.

— Сярожа ўжо вялікі, яму чатыры месяцы, — пажартавала Вера Захараўна. — І ўжо сур'ёзна: — За дзецьмі мама прыгледзіць.

І дамаглася накіравання ў акупіраваны Віцебск. Падрыхтавала сваю групу, якая перадавала інфармацыю аб варожых умацаваннях, руху войск, падбірала верных людзей для падполля.

Але гестапаўцы высачылі падпольшчыц...

***

Ёсць людзі, аб якіх яшчэ пры жыцці складаюць легенды. Людзі высокай ідэі, жалезнай волі, вялікага і шчодрага сэрца. Подзвіг для такіх — гэта ўменне выконваць свае абавязкі штодзённа, штогадзінна, нягледзячы ні на што. І жыццё яны вымяраюць не колькасцю пражытых дзён, а даўжынёй пройдзеных дарог.

Сёння імя такога чалавека— Веры Захараўны Харужай у нас ведае кожны школьнік. У Бабруйску, на яе радзіме, гэта імя носіць школа. У Мінску яе імем названа вуліца. Імя Веры з павагай і гонарам вымаўляюць у Маскве і Віцебску, у Казахстане і Сібіры — усюды, дзе пакінула гэта жанчына добры след.

(У артыкуле выкарыстаны матэрыялы «Учительской газеты» і «Магілёўскай праўды»).

# ЦУДОЎНЫЯ ДНІ НА НАРАЧЫ



У час канцэрту на розных мовах гучалі песні самадзейных спевакоў.

Фота М. Нечыпарэнкі.

Бабіным летам адцвілі цудоўныя летнія дні, але назаўсёды застануцца яны ў памяці тых, хто адпачываў на сінявокай Нарачы. Хіба можна забыць канцэрты, цікавыя дыспуты, вечары адпачынку, якія арганізоўвалі самі студэнты! Акрамя ўсяго гэтага — цудоўная паездка ў сталіцу Савецкай Літвы—Вільнюс. Экскурсавод Даля Куджмайтэ пазнаёміла турыстаў з гістарычнымі мясцінамі горада, Вільнюскім універсітэтам, новымі мікраёнамі.

А яшчэ, напэўна, кожнаму спадабалася падарожжа па возеру Нарач, на Блакітныя азёры, сустрэчы з былымі ўдзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны, з піянерамі рэспубліканскага лагера «Зубронак».

У дзень свята В'етнамскай рэвалюцыі юнакі і дзяўчаты з ДРВ, якія вучацца ў Беларускім політэхнічным інстытуце і ў нашым універсітэце, аформілі стэнд «В'етнаму 28 год». Увечары таго ж дня адбыўся канцэрт, прысвечаны гэтаму святу. Студэнты з В'етнама выконвалі песні на роднай і рускай мовах. Гераічнаму народу В'етнама былі прысвечаны выступленні студэнтаў з Самалі, Бангладэш, Кубы...

У час адпачынку студэнты выпускалі насценгазеты. Фотакарэспандэнты зрабілі цікавую фотагазету.

А. ШЫНКЕВІЧ, студэнт І курса факультэта журналістыкі.

# ХАРЧУЙЦЕСЯ ПРАВІЛЬНА

## (ПАРАДЫ ЎРАЧА)

На жаль, часта ў студэнцкім асяроддзі можна назіраць зняважлівыя адносіны да распарадку харчавання. Усухамятку праглынуце снеданне, бутэрброд або піражкі на абед і сытная вячэра — так харчуецца нямала дзяўчат і хлопцаў. Бязладныя адносіны да сябе яны растлумачваюць загружанасцю, нежаданнем траціць час і г. д. Але галоўная прычына — неразуменне правільнага харчавання, адсутнасць асабістай арганізаванасці. Як бы ні быў загружан у студэнта вучэбны дзень, наладзіць правільны рэжым харчавання не толькі можна, але і неабходна.

Аматарам есці «на хаду», за кнігай, тым, хто успымае ежу як неабходны абавязак, карысна памятаць, што няправільнае харчаванне зніжае працаздольнасць, аслабляе арганізм, павышае яго ўспрымальнасць да розных захворванняў. Звычайная расплата — хранічныя захворванні страўніка. Гастрыты, язвы страўніка, малакроўе — нярэдкія хваробы ўжо ў студэнцкім узросце.

Найбольш рацыянальна— есці чатыры разы ў дзень. Самым спажыўным павінна быць снеданне. Бо калорыі, якія паступаюць раніцай у арганізм, павінны пакрываць затраты, звязаныя з работай у першай палове дня. А яна ў студэнта, як правіла, вельмі напружаная.

Карысныя і не патрабуюць працяглай апрацоўкі сасіскі, розныя каўбасныя вырабы, яйкі. У рацыён студэнта абавязкова павінны ўваходзіць малако і кефір, тварог і цвёрдыя сыры. Можна рэкамендаваць на снеданне таксама кашы (грэчневую, манную, прасяную і г. д.).

Праз 3—4 гадзіны, у перапынку паміж заняткамі, патрэбна выкраіць час для другога снедання (гароднінныя стравы, кава, малако, бутэрброды).

Абедаць лепш за ўсё праз некаторы час пасля заняткаў. Кароткачасовая прагулка спрыяе адпачынку, выклікае апетыт. Першая страва абавязковая. Выключаць яе з абедзеннага меню нельга. У ёй утрымліваюцца экстрактыўныя рэчывы, якія ўзбуджаюць сакрэцыю страўнікавых залоз.

Вячэра павінна быць больш лёгкай, чым снеданне і абед. Нельга ўжываць на ноч тлустыя прадукты. Яны ўскладняюць работу органаў стрававання, а гэта перашкаджае нармальнаму сну.

Памятайце: ежа павінна не толькі прагнаць адчуванне голаду, але і аднаўляць энергетычныя затраты, утрымліваць дастатковую колькасць бялкоў, тлушчаў, вугляводаў, мінеральных солей, вітамінаў.

Рацыянальнае харчаванне з'яўляецца залогам моцнага здароўя. А здароўе лягчэй зберагчы, чым аднаўляць страчанае.

М. ЦЫРУЛЬНІКАВА, урач.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000

Аб'ём—1 друк. ар.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 06950

Зак. 1038.